Дадатак 2

**Урыўкі з п’есы “Хто смяецца апошнім” для прагляду і аналізу на ўроку:**

13.00 – 14.00 Гарлахвацкі цёці Каці: “Пабландзінілася”

30.00-… Тэлефонны званок

41.00 - 48.00 Туляга і Гарлахвацкі

59.40 – 1.00.00 Гарлахвацкі і Чарнавус

1.07.00 – 1.10.00 Туляга і Зёлкін

01.21.00 – 01.25.00 Чарнавус, Вера, Туляга

Дадатак 3

**<u>А –I – 1</u>**

**“Каму чорт дзетак калыша”**

**Фільм:** мультыплікацыйны фільм, Беларусьфільм ,1992
**Паводле літаратурнага твора:** казка У.Караткевіча “Каму чорт дзетак калыша”
**Рэжысёр:** А.Ленкін
**Час**: 10 хвілін
**Якасць фільма:** добрая, каляровы
**Мова:** беларуская

**“Лісце каштанаў”**

**Фільм**: мастацкі, 1981
**Аўтар інсцэніроўкі**: В. Чанкін
**Рэжысёр-пастаноўшчык**: У. Забела
**У ролях:** Васіль – А. Суцкавер, Раланд – Ю. Кухаронак, Яўген – У. Емельянаў,
Багдан – У. Рулёў
**Ад аўтара тэкст чытае:** П. Дубашынскі
**Час:** 91 хвіліна
**Якасць:** добрая, каляровы
**Мова:** беларуская

**“Паром на бурнай рацэ”**

**Фільм:** мастацкі, Мінск-тэлефільм, 1988
**Аўтар сцэнарыя**: А.Кудраўцава
**Пастаноўка**: В.Бокуна
**У ролях:** Пара Леановіч- М.Кавалеў**,** Гораў- Ю.Казючыц, Александрына-В.Ізотава
**Якасць**: добрая, каляровы
**Мова:** беларуская
**Час:** 38 хвілін

Дадатак 4

## Сістэма пытанняў да вучэбнага фільма “Максім Танк”

1. Ці праўда, што Максім Танк нарадзіўся ў Пількаўшчыне?
2. Якім яшчэ псеўданімам, акрамя агульнавядомых Максім Танк, А.Граніт, карыстаўся аўтар?
3. Як называецца першы зборнік вершаў Максіма Танка?
4. Дзе, паводле адказу аўтара, лепш за ўсё пісаліся вершы?
5. Што азначае “сінкрэтычная лірыка”?
6. Назва свабоднага верша, якім па-майстэрску авалодаў Максім Танк?
7. Максім Танк: “Прывыклі мераць талент дасягненнямі, а можа, варта …”
8. За які зборнік Танк атрымаў Дзяржаўную прэмію?
9. З якім возерам звязаны многія творы Максіма Танка?
10. Назва ўніверсітэта, які закончыў Максім Танк.

**Адказы на пытанні:**

1. Не.
2. Яўген Бура.
3. “На этапах”.
4. У турме.
5. У такой паэзіі няма чыста пейзажнай, любоўнай, ваеннай лірыкі, усё ўзаемазвязана.
6. Верлібр.
7. …паражэннямі.
8. “Нарачанскія сосны”.
9. Возера Нарач.
10. Танк не заканчваў універсітэта.